# СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫНІКІ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ● ДНІ СТУДЭНТАЎ МІНШЧЫНЫ Ў БДУ ● ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ ● ЮНЫЯ СЯБРЫ БІЁЛАГАЎ ● СПОРТ: СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ПА АРЫЕНТАВАННЮ ● НАШ КАЛЯНДАР ● НАТАТКІ З ВЫСТАЎКІ МАЛАДЫХ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ ● У ІНТЭРНАЦЕ — ВЕЧАР ПАЭЗІІ ● ЗАПРАШАЕМ ДА РАЗМОВЫ



ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (1145) ● 25 лістапада 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.


## ЛЕТА ПРЫНЯЛО ЭКЗАМЕН

На мінулым тыдні адбылася нарада камсамольскага актыву «Вынікі трэцяга працоўнага семестра 1976 года і асноўныя напрамкі падрыхтоўкі да лета 1977 года».

На нарадзе прысутнічалі сакратар Мінскага абкома ЛКСМБ Р. Давідовіч, сакратар парткома універсітэта М. Гарашчук, камандзір абласнога СБА К. Сухоцкі.

З аналізам вынікаў дзейнасці студэнтаў БДУ ў трэцім працоўным семестры 1976 г. і праграмай камітэта камсамола універсітэта па студэнцкаму будаўнічаму руху на будучае выступіў сакратар камітэта камсамола нашай установы А. Тозік.

(Вытрымкі з яго даклада мы прапаноўваем увазе чытачоў).

У абмеркаванні надзённых пытанняў СБА універсітэта прынялі ўдзел: сакратар камітэта камсамола юрфака, камандзір Крупскага занальнага атрада А. Грынкевіч, сакратар камітэта камсамола фізфака, камандзір занальнага атрада Комі АССР М. Абрамчук, сакратар камітэта камсамола мехмата, камандзір малдаўскага зводнага атрада В. Прокашава, іншыя камсамольцы — камандзіры і камісары СБА. На нарадзе быў заслухан праект пастановы бюро камітэта камсамола БДУ па выніках трэцяга працоўнага семестра 1976 г. і асноўных задачах падрыхтоўкі і правядзення працоўнага семестра будучага года. У пастанове адзначалася вялікая і плённая работа камітэтаў камсамола і штабаў працоўных спраў фізічнага і філалагічнага факультэтаў. ШПС універсітэта даручана вывучыць і абагульніць для распаўсюджання ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў вопыт работы СБА «Буравеснік» імя В. І. Казлова і СБА імя Ленінскага камсамола.

Быў зацверджан новы састаў штаба працоўных спраў універсітэта ў колькасці 16 чалавек. ШПС узначаліў аспірант кафедры гісторыі КПСС П. Брыгадзін.

(ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ).

## НА ЯКАСНА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

### З ВЫСТУПЛЕННЯ САКРАТАРА КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА А. ТОЗІКА

Адзначаючы ролю студэнцкага будаўнічага руху, П. М. Машэраў у справаздачным дакладзе на XXVIII з'ездзе КПБ падкрэсліваў: «Шматзначны плён гэтага руху відаць не толькі ў асвоеных капітальных укладаннях і пабудаваных аб'ектах, што каштоўна і патрэбна нашаму народу, але не ў меншай меры і ў яго ідэйна-маральных матывах і выніках. Бо студэнцкі будаўнічы атрад моцна звязаў працу тысяч юнакоў і дзяўчат з працай усёй краіны, даўшы ім магчымасць праявіць свае здольнасці і ўменне». Якасць фарміравання студэнцкіх будаўнічых атрадаў і кіраўніцтва іх дзейнасцю з'яўляецца ў цяперашні час адным з найважнейшых паказчыкаў дзейнасці камсамольскіх арганізацый ВНУ, установы ў цэлым.

У адпаведнасці з рашэннем Мінскага абласнога камітэта ЛКСМБ у БДУ для работы ў трэцім працоўным семестры 1976 года неабходна было сфарміраваць 52 студэнцкія будаўнічыя атрады агульнай колькасцю 1750 байцоў. Фактычна намі было сфарміравана 66 атрадаў агульнай колькасцю 2077 чалавек. Перавыкананне плана было дасягнута ў выніку стварэння 4 атрадаў з ліку выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, пераносу ці сумяшчэння некаторых відаў практыкі. Па ініцыятыве камітэта камсамола БДУ на базе фізічнага факультэта быў сфарміраван атрад колькасцю 45 чалавек для работы ў раёне землетрасення (Узбекская ССР).

18 найбольш падрыхтаваных выкладчыкаў, камсамольскіх актывістаў былі накіраваны для работы ў абласным і 6 — у занальных штабах СБА. Сярод камандзіраў і камісараў лінейных атрадаў, работнікаў занальных і абласнога штабаў было 63 камуністы (45 працэнтаў ад агульнага ліку).

**Працуючы на будоўлях краіны пад дэвізам «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых», студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта асвоілі ў 1976 годзе 5,1 млн. рублёй капіталаўкладанняў (выпрацоўка на аднаго чалавека склала каля 2,5 тыс. руб.). Імі пабудавана 14 жылых дамоў, 12 сельскагаспадарчых ферм, 9 школ, 2 бальніцы, 5 магазінаў, дзесяткі іншых аб'ектаў. Атрадамі, якія былі ў Малдавіі, сабрана 3,8 тысячы тон гародніны і садавіны.**

**Студэнцкімі будаўнічымі атрадамі ў рабочы перыяд была праведзена значная маса-палітычная, ваенна-патрыятычная, шэфская работа. Агітбрыгадамі СБА для будаўнікоў, хлебаробаў было дадзена 487 канцэртаў мастацкай самадзейнасці. Лектарскімі групамі атрадаў прачытана і праведзена 681 лекцыя і гутарка. (Прыкладная праграма выступленняў агітбрыгад і прыкладная тэматыка лекцый былі распрацаваны і зацверджаны камітэтам камсамола універсітэта).**

У 28 піянерскіх лагерах-спадарожніках пры студэнцкіх будаўнічых атрадах БДУ правялі летнія канікулы звыш 400 вясковых школьнікаў. Разам са студэнтамі будаўнічых атрадаў працавалі 24 цяжкавыхоўваемыя падлеткі, якія стаяць на ўліку ў дзіцячых пакоях міліцыі.

Удзельнічаючы ва ўсесаюзнай кампаніі «Камсамол — вясковай школе», студэнты пабудавалі 9 школ, правялі бягучы рамонт 27 школьных памяшканняў, абсталявалі 58 школьных кабінетаў,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## *Дні студэнтаў Міншчыны ў БДУ*





Вялікай папулярнасцю карысталіся Дні студэнтаў Міншчыны, якія праходзілі з 11 лістапада па сённяшні дзень. Шмат удзельнікаў сабрала, напрыклад, студэнцкая навуковая канферэнцыя «Студэнцкая навука — Ленінскаму камсамолу». У выступленнях выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў як адна з галоўнейшых вылучалася задача па далейшаму паляпшэнню падрыхтоўкі і выхавання кваліфікаваных спецыялістаў. Падкрэслівалася, што для вырашэння гэтай задачы вялікае значэнне мае самастойная творчасць студэнтаў. На канферэнцыі станоўчая ацэнка была дадзена камітэту камсамола БДУ па ідэйна-палітычнаму выхаванню студэнцтва.

А. ГАЛАВАЧОВА.



На здымках: выступае Д. Мельцар; даклад чытае в'етнамскі студэнт Фан Кai; ідзе пленарнае пасяджэнне.

Фота А. Шарава.

## НА ПУЛЬСЕ ЧАСУ

18—19 лістапада ў БДУ праходзіў III Рэспубліканскі навукова-практычны семінар бібліятэкараў. На ім прысутнічалі супрацоўнікі бібліятэк і інфармацыйных служб ВНУ БССР. Мэта семінара — вывучыць і абагульніць вопыт работы ВНУ па арганізацыі інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння, вызначыць перспектывы развіцця даведачна-інфармацыйнай службы бібліятэк у святле пастановы ЦК КПСС «Аб павышэнні ролі бібліятэк у камуністычным выхаванні працоўных і навукова-тэхнічным прагрэсе».

На семінары з дакладам «Арганізацыя і задачы па ўдасканаленню даведачна-інфармацыйнага абслугоўвання чытачоў ВНУ ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ» выступіла дырэктар бібліятэкі нашага універсітэта І. Арэхоўская. Прысутныя разглядалі такія пытанні, як месца і роля інфармацыйных выданняў у сістэме інфармацыйнага абслугоўвання, аўтаматызаваная падсістэма навукова-тэхнічнай інфармацыі (у рамках АСК ВНУ), праца бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў па стварэнню навукова-дапаможных бібліяграфічных сродкаў і шэраг іншых.

— Навукова-тэхнічная інфармацыя для вышэйшай школы надзвычайна важная ў сувязі з тым, што і зараз ідзе бурнае, шырокае развіццё навукі, тэхнікі. Для падрыхтоўкі будучых спецыялістаў трэба выкарыстоўваць вялікі паток інфармацыі, — сказаў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР І. Леановіч. — Бібліятэка ВНУ — буйны інфармацыйны цэнтр.

— У інстытутах, універсітэтах, — працягвае размову загадчык метадычнага аддзела НДІ праблем вышэйшай школы Н. Галаніна, — павінна быць адзіная служба навуковай інфармацыі, якая б забяспечвала ўсе запатрабаванні чытачоў.

У заключэнне семінара слова ўзяла І. Арэхоўская:

— У практыку сваёй працы нам трэба шырэй укараняць усё передавое, добра зарэкамендаваўшае сябе новае, цікавае. І яшчэ — мы павінны як мага больш увагі ўдзяляць студэнтам-вячэрнікам, завочнікам, дапамагаць выкананню кантрольных работ, павышэнню культурнага ўзроўню. Гэта нашы «ўнутраныя» задачы.

За гэтыя дні мы шмат гаварылі і пра «знешнюю» палітыку. Задача ўсіх бібліятэк ВНУ БССР — стварыць міжвузаўскую бібліятэчную сістэму.

А. МАРЧУК.

## ВУЧАЦЦА АКТЫВІСТЫ

На гістарычным факультэце паспяхова дзейнічае школа камсамольскага актыву.

На мінулым тыдні перад студэнтамі выступіў прафесар, загадчык кафедры гісторыі КПСС БПІ А. Жураў, які вёў гутарку аб галоўнай задачы моладзі ў сучасны перыяд. Ён пазнаёміў слухачоў з некаторымі асаблівасцямі ленінскай тэорыі камуністычнага выхавання, правёў цікавыя жыццёвыя прыклады, адказаў на пытанні.

Другая частка пасяджэння была прысвечана вырашэнню практычных пытанняў. Прыняць удзел у спаборніцтве за гонар падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола, паспяхова правесці Ленінскі залік, палепшыць вучэбную работу на курсах — гэтыя і шэраг іншых праблем вырашалі разам з актывам сакратар камітэта камсамола гістфака В. Левашэвіч і члены камітэта.

Школа цікава арганізавана, яе занятні праводзяцца штомесячна.

У плане ШКА прадугледжан шэраг цікавых мерапрыемстваў, лекцый. Іх падрыхтуюць для студэнтаў гістарычнага факультэта работнікі РК ЛКСМБ г. Мінска, работнікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, выкладчыкі БДУ і многія іншыя камсамольскія і партыйныя работнікі.

Значная ўвага будзе ўдзелена практычнай рабоце. Методыка арганізацыі вечароў адпачынку, работа актыву групы па ўмацаванню СБА, арганізацыя агітбрыгад, удасканаленне вучэбнай работы — распрацоўка гэтых тэм, безумоўна, прынясе камсамольскім актывістам веды і вопыт.

Н. АРЛОЎСКАЯ.

# НА ЯКАСНА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

(Заканчэнне. Пача ак на 1-й стар.).

пабудавалі 26 будаўнічых пляцовак.

Будатрады універсітэта перадалі будаўнікам і вясковым школьнікам больш 2 тысяч тамоў кніг.

**Па выніках трэцяга працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяды) месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам:**

**1-е МЕСЦА—ФІЗФАК, 2-е — ФІЛФАК, 3-е—ГІСТФАК, 4-е — ХІМФАК, 5-е — ЮРФАК, 6-е—ФПМ І МЕХМАТ.**

**Рад атрадаў універсітэта дабіўся высокіх паказчыкаў у вытворчай і масава-палітычнай рабоце. Гэта такія атрады, як СБА філфака «Буравеснік» імя В. І. Казлова (камандзір Н. Прыгодзіч, камісар З. Дарашчонак), зводны атрад імя Ленінскага камсамола (камандзір У. Карагін, камісар В. Рошчын), атрады гістарычнага факультэта «Няміга» (камандзір П. Савасцёнак, камісар В. Левашэвіч), імя Чэ Гевары (камандзір В. Кунцэвіч, камісар І. Маеўскі), ФПМ—«Юнацтва-76» (камандзір І. Багамаз, камісар В. Прохараў), малдаўскія атрады: філфака — «Мара» (камандзір В. Старычонак, камісар Г. Жыбутка), мехмата «Расінка» (камандзір Ф. Муртазіна, камісар Г. Гульковіч). Нядрэнна папрацавалі гарадскі атрад фізікаў «Венера» (камандзір Л. Цепляшын, камісар В. Зінкевіч), атрад хімікаў «Буравеснік» (камандзір А. Гавядзінаў, камісар В. Бяляцкі) і некаторыя іншыя.**

Добрую памяць пакінулі аб сабе гэтыя атрады людзям. Назаўсёды запомняцца яны і іх байцам.

Не менш падрабязна я хачу спыніцца на нашых памылках, пpaлiкax, нявыкарыстаных магчымасцях. З 66 нашых атрадаў у поўным саставе да месца дыслакацыі прыбылі толькі 14. 52 атрады «згубілі» па дарозе да месца работы некаторых сваіх байцоў. У многіх атрадах цяжка было знайсці па-сапраўднаму аформлены лагер. У пастанове сакратарыята Мінскага абкома ЛКСМБ ад 11. VIII. 1976 г. справядліва адзначалася: «Марудна разгортваецца дзейнасць лектарскіх груп і агітбрыгад. Рад атрадаў за трыццаць дзён працоўнага семестра не даў ні аднаго канцэрта. Пакідае жадаць лепшага работа рэдкалегій, бяздзейнічаюць штабы «КП», лекцыйныя распрацоўкі маюць агульны характар, адарваны ад мясцовага матэрыялу».

На наш погляд, указаныя недахопы ў дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта тлумачацца наступным:

— Большасць членаў штаба працоўных спраў БДУ на працягу года практычна не працавала.

— Нездавальняюча працавалі штабы працоўных спраў факультэтаў. Гэта асабліва датычыцца штабаў працоўных спраў мехмата, ФПМ, хімфака.

— Камітэт камсамола універсітэта не выкарыстаў усе магчымасці пры падборы і выхаванні камандзіраў і камісараў. Слабай была арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва паміж атрадамі ў падрыхтоўчы перыяд. Спаборніцтва не было эфектыўна наладжана ні ў маштабах універсітэта, ні на факультэтах. Бяздзейнічалі лектарскія групы, агіткалектывы атрадаў у падрыхтоўчы перыяд. План фарміравання універсітэту быў даведзен абласным штабам вельмі позна—у сакавіку месяцы. Спешна прайшла і кампанія заключэння дагавораў; не была арганізавана прафесійная падрыхтоўка байцоў атрадаў. Атрады універсітэта практычна былі раскіданы па ўсёй краіне, што ўскладняла кантроль за іх дзейнасцю ў рабочы перыяд.

Толькі ўважліва прааналізаваўшы і выправіўшы памылкі, вызначыўшы рэзервы і магчымасці для плённай працы, мы можам выканаць нашу задачу—выйсці на перадавыя рубяжы ў студэнцкім будаўнічым руху не толькі рэспублікі, але і краіны. І справа гонару нашай арганізацыі — выйсці на такія рубяжы ў 1977, юбілейным для нашай краіны годзе.

З першых дзён патрэбна разгарнуць дакладную работу штабаў працоўных спраў факультэтаў. Штабы працоўных спраў выбраны ў нас на справаздачна-выбарных камсамольскіх сходах і канферэнцыях у канцы кастрычніка — пачатку лістапада г. г. На жаль, дзейнасць асобных штабаў (фізфак — начштаба Н. Філімончык, хімфак — начштаба С. Альфер) ужо цяпер выклікае сумненні ў тым, што яны справяцца са сваімі абавязкамі. Зыходзячы з магчымасцей універсітэта, бюро камітэта камсамола распрацавала план фарміравання атрадаў па факультэтах. У гэтым навучальным годзе ў сувязі з пераходам на новыя вучэбныя планы база фарміравання ў нас некалькі скарацілася, і мы прапаноўваем сфарміраваць зводны атрад агульнай колькасцю 1,5 тыс. байцоў.

Мы лічым таксама мэтазгодным звярнуцца з просьбай у абласныя камітэт ЛКСМБ і штаб СБА перавесці нашы атрады з Крупскай зоны ў нашы падшэфныя раёны (Нясвіжскі, Стаўбцоўскі, Дзяржынскі, Клецкі) Нясвіжскай зоны. Гэта зробіць для нас больш цесны кантакт з кіруючымі органамі раёнаў; дасць магчымасць перайсці да заключэння доўгатэрміновых дагавораў і звязаць факультэты з пэўнымі раёнамі, арганізаваць больш пільную і эфектыўную праверку гатоўнасці арганізацый да прыёму атрадаў, разгарнуць лекцыйна-прапагандысцкую і масава-палітычную дзейнасць атрадаў на месцах будучай работы не ў рабочы перыяд, а некалькі раней.

Відаць, ёсць неабходнасць у перыяд зімовых канікулаў стварыць адзін-два зімнія СБА (вопыт па іх стварэнню ў нас ужо ёсць) пад кіраўніцтвам вопытных камандзіраў і камісараў. Ёсць неабходнасць таксама ў сакавіку—красавіку на базе аднаго з мінскіх будтрэстаў арганізаваць прафпадрыхтоўку нашых байцоў па асноўных спецыяльнасцях (муляры, цесляры, стропальшчыкі).

Камітэтам камсамола і штабам працоўных спраў неабходна значна лепш каардынаваць сваю работу па фарміраванню атрадаў з партыйнымі бюро, абапірацца на іх дзейсную дапамогу, а не спадзявацца толькі на свае сілы і вопыт.

## Дні студэнтаў Міншчыны ў БДУ



Аўтобус крануўся з месца, прабіраючыся скрозь дробную сетку асенняга дажджу. Усе былі на сваіх месцах: і ўдзельнікі вакальна-інструментальнага ансамбля, і тэатр мініяцюр, і вакальная група дзяўчат. Агітбрыгада факультэта журналістыкі трымала шлях да сваіх падшэфных вучняў Грыцэвіцкай сярэдняй школы Клецкага раёна.

Я ўпершыню адправіўся ў такую паездку. Моўчкі сядзеў, уткнуўшыся ў запацелае шкло, — хваляваўся. Хоць і не на агляд-конкурс едзем, і страга судзіць ніхто не збіраецца, але ўсё роўна...

— Ведаеш, — нахіліўся Саша Прастата, адказны за культмасавы сектар, — я многа раз удзельнічаў у такіх мерапрыемствах... Чацвёрты год, пара, здаецца, і прывыкнуць. Але як толькі зноў паездка, міжволі ахоплівае хваляванне. Вось і сёння... Грыцэвіцкія школьнікі — нашы новыя падшэфныя, будзем знаёміцца, па сутнасці, зараз.

Вечар адкрыўся. Аляксандр Канстанцінавіч Свораб, выкладчык, перадаў гарачае прывітанне сабраўшымся ад усяго калектыву факультэта, расказаў падрабязна пра універсітэт, яго святы і будні. Студэнтка журфака Алена Малочка уручыла камсамольскай арганізацыі школы бібліятэчку, сабраную камсамольцамі. А потым быў канцэрт. Мелодыі народных песень, палымяныя радкі Маякоўскага і пяшчотныя — Ясеніна, звон гітары, жарты тэатра мініяцюр і развітальнае «Бывайце здаровы...» — так непрыкметна праляцелі дзве гадзіны. І прыемна было слухаць шчырыя апладысменты, прымаць сувеніры грыцэвіцкіх піянераў.

Пасля мы бліжэй пазнаёміліся са школай, яе кабінетамі. Цікавай была размова са старшакласнікамі. У іх цяпер паваротны момант у жыцці, і хто ведае, можа нехта прыйдзе паступаць на наш факультэт.

Зноў дарога. Абменьваемся ўражаннямі, будуем планы на будучае. Наперадзе — паездка да вучняў Галыноўскай школы Клецкага раёна. Цікава, якой яна атрымаецца?

**С. САСІМ.**

Фота **А. Басава.**





# КАРЫСНАЕ ПАЧЫНАННЕ

На біялагічным факультэце створана дружына па ахове прыроды. Кіруе ёю выкладчык заалогіі Алег Канстанцінавіч Фядосаў. Я пазнаёмілася з некаторымі з членаў дружыны.

Сяргей **Фацееў**, студэнт II курса біялагічнага факультэта, член таварыства аховы прыроды:

— Наша арганізацыя добраахвотная. Мы маем права выяўляць асобы, якія парушаюць законы аб ахове прыроды, забруджваюць вадаёмы, парушаюць правілы рыбалоўства, паляўніцтва, высечкі лесу; затрымліваць незаконную здабычу паляўніцтва, складаць пратаколы і накіроўваць іх для прыняцця мер у адпаведныя дзяржаўныя органы.

**— Але для таго, каб выкарыстаць свае правы як члена таварыства, патрэбны цвёрдыя веды законаў?**

— Так. канешне. Выкрыў у злачынстве—ясна і дакладна выкладзі сутнасць злачынства. З гэтай мэтай у нас праводзяцца тэарэтычныя заняткі, на якіх мы знаёмімся з законамі па ахове прыроды, з правіламі запаўнення пратаколаў; праходзім разбор паляўнічых прыналежнасцей, дакументаў.

**-- Сяргей, ваша дружына раз у тыдзень робіць выезды за горад. У чым заключаюцца гэтыя выезды?**

— Усе жадаючыя ў нядзелю робяць рэйды на браканьераў. Асабліва шмат работы перад Новым годам, калі некаторыя грамадзяне незаконна высякаюць за горадам ёлкі і потым спекулююць імі. Ёлкі аднімаюцца і рэалізуюцца намі па квітанцыях. Так, у мінулым годзе было рэалізавана ёлак на 180 рублёў.

— У адрозненне ад дружыны Маскоўскага універсітэта, дзе я нядаўна пабываў, — гаворыць студэнт III курса біялагічнага факультэта Дзмітрый **Гельтман**, — нашай дружыне ўдзяляецца недастатковая ўвага з боку выкладчыцкага саставу, няма ніякай матэрыяльнай падтрымкі. Але галоўнае цяпер — выпрацоўка дакладнай арганізацыйнай структуры, да чаго мы і імкнемся.

Нам патрэбны масы: студэнты ўсіх факультэтаў БДУ. Кожнаму знойдзецца справа па душы. Грамадскі інспектар па ахове прыроды — важная і патрэбная справа.

**Л. КОПАЦЬ.**

## У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

**Па-ўдарнаму працавалі студэнты механіка-матэматычнага факультэта ў час Дзён працы. Брыгады камсамольцаў былі заняты работай на маторным і фурнітурным заводах, на заводзе халадзільнікаў. На МЗХ рабяты выканалі заданне на 110,2 працэнта. Будаўнічыя ўпраўленні № 21 і № 24 у сваіх характарыстыках выказалі падзяку студэнтам за добрую працу.**

**Аднак патрэбна адзначыць, што на фурнітурным заводзе ў першы дзень рабятам не знайшлося работы. Гэта гаворыць аб дрэннай арганізацыі з боку кіраўніцтва завода.**

***

**Нядаўна на факультэце праходзілі Дні памяці герояў. Усе групы першага курса наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Студэнты ўсклалі кветкі да Памятнага знака загінуўшым воінам-выпускнікам і студэнтам БДУ. 32 студэнты, якія найлепш працавалі ў час сельгасработ, 28 лістапада паедуць у Хатынь і на Курган Славы.**

**Б. ЧАРНУШЭНКА.**

